# Ведай свой край

## *(фарміраванне ў вучняў цэласных уяўленняў аб мінулым нашага краю; накірункі, формы і метады краязнаўчай работы)*

**Сцяпан Нефідовіч,**
**літаратар і краязнавец, в.Любань**

Далучэнне вучняў да культурна-гістарычнай спадчыны сваёй Радзімы - важны сродак фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. На жаль, сучасныя радыё- і тэлеперадачы напоўнены інфармацыяй, што нясе духоўнае спусташэнне, паказваюць свет нерэальнасці, крамолы. Перадачы не звязваюць нас з мінулым народа, аддаляюць ад унікальнай традыцыйнай культуры, ад яе самабытнасці, ад багатай гістарычнай спадчыны продкаў. Адзіная перадача "Падарожжа дылетанта" - хіба яна можа задаволіць?

Гэты прабел у душах нашай моладзі можа запоўніць краязнаўства. Вывучэнне роднага краю - гэта не толькі пазнанне сваёй мінуўшчыны, але і грамадзянскае выхаванне.

Некаторую долю ў краязнаўчай рабоце можа ўзяць на сябе раённы музей, але асноўную функцыю, лічу, павінна адыграць школа. Краязнаўчая работа - шматгранная, і весці яе можна ў выглядзе гуртковай работы ці факультатываў, а некаторыя тэмы варта ўвесці ў праграму ўрокаў гісторыі, літаратуры і нават мовы (архаізмы, гістарызмы, дыялектныя словы, фразеалагізмы).

Лунінеччына - край гераічны. Тут вяліся баявыя дзеянні у час грамад-

зянскай і Вялікай Айчыннай войнаў; тут у час акупацыі дзейнічалі партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі; у гады вайны фашысты чынілі зверствы, і шмат хто яшчэ помніць ваенныя жахі; у кожным населеным пункце яшчэ жывуць франтавікі. Раённым турыстычным цэнтрам распрацавана цэлая серыя турыстычных паходаў рознага накірунку і рознага тыпу (пешаходныя, веласіпедныя, аўтобусныя), сярод якіх шмат маршрутаў гістарычнага плану, па іх могуць прайсці ці праехаць настаўнікі і вучні, азнаёміцца з гераічнымі мясцінамі, сустрэцца са сведкамі вайны, запісаць самыя важныя факты таго часу.

Вялікую краязнаўчую работу можна правесці па вывучэнні культуры Лунінеччыны. У нашых палешукоў багатая культурная спадчына ў сферы быту, традыцый, паводзін і сямейных адносін на розных гістарычных этапах: у царскі час, у польскі перыяд, у 1950-80-я гады. Можна асэнсаваць стан сучаснай нашай культуры, яе росквіт ці ўпадак; прааналізаваць прычыны маральнага разлажэння, самая нізкая ступень якога - п'янства.

Са старажытнага часу на Лунінеччыне існавала і існуе шмат культавых будынкаў (цэркваў, касцёлаў і інш.). І кожны аб'ект мае своеасаблівую гісторыю, архітэктуру, іканапіс, кнігі ці вопісы; вывучэнне іх - цікавая справа.

Шырокае пазнанне культуры, быту мінулага можа даць праца на фальклорнай ніве. У песнях, легендах, прыказках і прымаўках - і мудрасць народа, і адлюстраванне жыцця, і абрадавыя традыцыі, і каляндар.У фальклоры адлюстравана наша гісторыя: казацтва, чумацтва, рэкруцтва, барацьба з ворагамі, уклад жыцця. Усё гэта можна вывучыць у фальклорных экспедыцыях. Добра, калі паралельна будзе арганізавана лінгвістычная работа. Дыялектныя словы - гэта моўная скарбніца, а іншае слова - загадка. Ад людзей можна даведацца, як называюцца травы, зёлкі, кветкі, што крыецца ў гэтых назвах, пра лекавыя ўласцівасці; даведацца, як называюцца грыбы, птушкі. У звычайных дыялектных словах, зваротах таксама шмат каштоўнага, асабліва калі ўнікнуць у іх гістарычны корань.

Не менш цікавага можна знайсці, калі ўключыцца ў тапанімічныя даследванні. У назвах мясцін - шмат своеасаблівага, адметнага, іншы раз таемнага. У кожнай вёскі, урочышча, хутара маецца свая гісторыя, бывае, даволі цікавая. Знікаюць рэчачкі, хутары, нават вёскі, а з імі і іх гісторыі, назвы. Пакуль жывуць старыя людзі, трэба сустракацца з імі, запісваць усё, каб не згубіліся назаўсёды ні назвы тых аб'ектаў, ні іх гісторыя.

Лунінеччына не багата на пісьменнікаў, наша зямля дала толькі трох празаікаў - членаў пісьменніцкіх саюзаў: Івана Макаловіча (в.Дубаўка), Мікалая Калінковіча (в.Цна), Мікалая Еляне ўскага (в.Лунін), адну паэтку - Аксану Спрынчан (г.Лунінец). Затое ў нашым краі некаторы час жылі і працавалі Якуб Колас, Ул.Нядзведскі, А.Гардзіцкі, А.Макаёнак, М.Федзюковіч і інш., у жыцці якіх ці ў іх творчасці Лунінеччына пакінула свой след ці гэтыя людзі аставілі тут хоць які-небудзь знак. Пажадана, каб нашы даследчыкі асвятлілі важнейшыя падзеі іх літаратурнага жыцця.

Вывучаць флору і фауну нашага краю - таксама адзін з накірункаў краязнаўчай работы. Добра было б, каб настаўнікі азнаёмілі вучняў з кнігай аб прыродзе Лунінецкага раёна, створанай І.А. і Л.К.Панасюкамі. Варта вясной-летам правесці экскурсіі ў прыроду, каб знайсці рэдкія расліны, узяць іх пад ахову, вывучаць іх.

На тэрыторыі нашага раёна дзейнічае і аддзяленне таварыства "Ахова птушак Беларусі". Пажадана, каб краязнаўцы звязаліся з яго членамі. У таварыстве вядзецца не толькі работа па ахове птушак, але і вывучаецца флора нашага рэгіёна.

Краязнаўчая работа - справа карпатлівая, яна патрабуе цярплівасці, пранікнення, дапытлівасці і часу. Іншы раз, каб знайсці якісьці факт, прыходзіцца перачытаць кіпы даўніх газет, звязвацца з архівамі ці правесці

мноства сустрэч з дасведчанымі ў патрэбнай галіне людзьмі.

Пачынаючым краязнаўцам я параіў бы пачаць працу з вывучэння свайго радаводу: адкуль ваш род і прозвішча, хто вашы продкі і чым яны вядомы. Складанне радаводу - справа няцяжкая, але пачэсная. Любоў да роднага краю пачынаецца з любові да сваіх родных, блізкіх, потым пераходзіць у любоў да сваёй радзмы, да яе гісторыі.

А гэта і ёсць выток краязнаўства.